# АЛЬБИНО

**№102, II квартал 2012 года**

Издание для любителей шахматной композиции.
Тираж 100 экз. Редактор Вадим Жилко.


Адрес: 225644, г.Лунинец Брестской обл., ул.Красноармейская, 23, кв. 2 или E-mail: vadim_ne67@mail.ru




**наш эпиграф**

***А.Олейник (Россия). Публикуется впервые.***
***8+7. 2х*** 1.Kpd2? (2.Лb1x, 2.Лc2x) b3!, 1.0-0? (2.Лf2x) Фh5(h4)! Решает 1.Лh2! (2.g3x, 2.g4x) Фh5 2.g4x, 1...Фh4+ 2.g3x, 1...Ф:h3 2.ghx, 1...f3 2.gfx Альбино.

*Второй из четырёх номеров «Альбино» этого года получился, признаемся, не совсем «современным»... Однако знать историю шахматной композиции образованному любителю, а тем более профессионалу, тоже не помешает.*

# ПРА ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС «ЧЫРВОНАЙ БЕЛАРУСІ» (1931-32 гг.)

У кнізе 1981 г. «Шахматная композиция в Белоруссии» сказана: *«…шахматный отдел под редакцией Я.Каменецкого стал регулярно выходить в республиканском журнале “Чырвоная Беларусь”. Журнал в 1932-33 годах провёл ряд международных конкурсов составления двуххodовых задач. В них участвовали и молодые белорусские композиторы: минчане П.Абрамович и Я.Каменецкий, гомельчанин Н.Житомирский. На конкурс 1932 года поступило 80 задач»* (с.6). Многае тут праўда, а сёетое паблытана і недагаворана.

Насамрэч, аддзел у «тонкім» ілюстраваным часопісе «Чырвоная Беларусь» больш-менш рэгулярна выходзіў у 1931-33 гг. пад кіраўніцтвам Я.Камянецкага і А.Касперскага (з 1932 г. - аднаго Я. Камянецкага). Пра конкурс складання двуххадовых задач з фондам 150 рублёў было заяўлена ўжо ў 3-м выпуску шахматнага аддзела - у №13 «ЧБ» (ліпень 1931 г.). Грошы, хутчэй за ўсё, вылучыў ВСФКБ - Вышэйшы савет фізічнай культуры Беларусі. Прадугледжваліся звычайныя і спецыяльныя прэміі - праблемістам-пачаткоўцам з БССР і СССР, а таксама за тэматычныя задачы (заахвочваліся непрыкметныя перакрыцці і блокі).

Згодна з духам часу, вядучыя аддзелу абвясцілі барацьбу апалітызму і не прамінулі даць выспятка былому старшыні Ўсесаюзнага аб’яднаньня аматараў шахматных задач і эцюдаў, *«шкодніку Залкінду»*, асуджанаму з падачы М.Крыленкі. Я.Камянецкі і А.Касперскі выставілі амбітныя мэты: *«100% ахоп усіх савецкіх кампазітараў конкурсам»* ды *«прыцягненне лепшых замежных кампазітараў»*. Першая мэта была выканана працэнтаў на 20, другая - на 0%...

Імпрэза доўжылася амаль год. *«На конкурс атрымана 81 задача ад 30 аўтараў»,* - напісаў 19-гадовы суддзя, будучы гросмайстар шахматнай кампазіцыі Яўген Умноў (Я.У.), у выніковай справаздачы («ЧБ», №10, май 1932). Спярша ён пералічыў толькі 29 імёнаў праблемістаў, потым згадаў яшчэ адно імя. Усе аўтары прадстаўлялі СССР: Расію (19), Украіну (5), Беларусь (4), Арменію (1) і Грузію (1). Такім чынам, спаборніцтва аказалася не міжнародным, а ўсесаюзным, што ў рэшце рэшт прызналі і арганізатары[1].

Першапачаткова задачы планавалася прымаць да 1 снежня 1931 г., пазней («ЧБ», №22-23/1931) крайні тэрмін быў перанесены на 1 лютага 1932 г. Задачы прысылаліся пад дэвізамі кшталту «Чырвоны спорт» і «Емсімб», хаця былі і менш палітызаваныя: «Эмілія 2», «Ператварэнне»... З кампазітараў БССР сваімі творамі парадавалі рашальнікаў не толькі менчукі Я.Камянецкі (як вядучы аддзела ён выступаў па-за конкурсам) і П.Абрамовіч ды гамельчанін Н. (або М.) Жытомірскі, але і М.Ратнікаў з Горак. Цяпер гэты горад належыць да Магілёўскай вобласці, а ў 1930-я гг. паходжанне маладога кампазітара пазначалі так: *«Горкі на Аршанишчыне»* або проста *«Ворша»*.

Нават з беларускіх праблемістаў далёка не ўсе адгукнуліся на заклік Я.Камянецкага. Шкада, напрыклад, што конкурс не зацікавіў Г.М.Верасава, які пад канец 1920-х складаў акурат задачы на мат за 2 хады: відавочна, у 1931 г. віцэ-чэмпіён Менска Гаўрыла Верасаў захапляўся ўжо больш гульнёй, вочнай і завочнай. З іншага боку, праз пару гадоў ён усё ж знойдзе магчымасць паўдзельнічаць у кампазітарскім матчы «Беларусь - Цэнтральна-Чарназёмная вобласць» - на 5-й дошцы.

Мяркую, самая пара працытаваць справаздачу арбітра конкурсу 1931-32 гг.: *«Усе задачы былі падзелены на 4 групы: 1) задачы няправільныя, 2) задачы слабыя і нездавальняючыя, 3) задачы здавальняючыя і 4) задачы добрыя»*. У першую групу трапіла 20 задач - праз папярэднікаў, немагчымасць становішчы, пабочныя рашэнні або адсутнасць рашэнняў. Некаторыя аўтары слалі задачы, якія ўжо друкаваліся ў іншых выданнях - такія творы таксама былі выключаны з конкурсу. У трэцяй і чацвёртай групах аказалася 25 і 19 задач - г.зн. у брак пайшло амаль 50% дасланых твораў. Што не перашкодзіла арбітру ганарліва заявіць: *«Конкурс “Чырвонай Беларусі”, у якім удзельнічалі амаль усе савецкія праблемісты, лішні раз красамоўна паказаў той росквіт задачнага мастацтва, які мы маем у СССР, у процівагу капіталістычным краінам, дзе ўплыў крызісу сказваецца ў адсутнасці новых ідэй, а калі такія і з’яўляюцца, дык выключна перанятыя з нашых конкурсаў»*[2]…

Аднак досыць ідэалагічнай нісянецыі. Пяройдзем, нарэшце, да саміх задач, балазе ў іх ёсць на што паглядзець. Рашэнні ў часопісе не даваліся, бо Я.Камянецкі вырашыў скарыстаць 16 прэміяваных задач для конкурсу рашэнняў - між іншага і для таго, *«каб даведацца, наколькі задачы конкурсу арыгінальныя, ці не маюць яны якіх дэфектаў…»* Заўваг не паступіла, і з 1 студзеня 1933 г. вынікі, агучаныя ў траўні 1932 г., набылі сілу.

Першы прыз заваявала задача будучага гросмайстра ШК **Л.Лашынскага** з Растова-на-Доне. **8+13. 2х**



Рашэнне: 1.Kg7! Каментар Я.У.: *«Вельмі цяжкая для выканання тэма - 5 развязанняў белага ферзя, прадстаўленая да гэтага часу ў 2-3 задачах, праводзіцца тут з выключнай прастатою і лёгкасцю. Кідаецца ў вочы бяспрымусовасць і разам з гэтым глыбокі змест падзелу мата ва ўсіх варыянтах. Бліскучая тэхнічная апрацоўка - агульная канфігурацыя, адсутнасць белых пешак, чоткасць усёй гульні - усё гэта выдае руку вялікага майстра»*.

Другі прыз выпаў твору настаўніка і сааўтара Я.Камянецкага, масквіча **Л.Гугеля. 11+14. 2х** Рашэн-



не: 1.d4! Я.У.: *«Калі першая задача - цалкам даніна тэхніцы, дык другая мае вялікі ідэйны змест. Складаны тэматычны комплекс задачы з’яўляецца далейшым паглыбленнем*

*камбінацыі, прадстаўленай упершыню ў задачы Я.Умнова (2 пр. “64”, 1930/II). Два асноўныя варыянты 1…f6+ 2.Kce7x і 1…Kd7 2.Kfe7x праведзены тут у злучэнні з другой парай ідэйных гульняў: 1…C:d4 2.Kb4x і 1…Л:d4 2.Ke3x Канструкцыйная складанасць гэтай арыгінальнай камбінацыі прывяла да некаторай грувасткасці і грубаватасці пабудовы. Тэхнічным дэфектам мы лічым першы ход і грубую пагрозу».* На роўных з А. Студзянецкім атрымаў Л.Гугель і I-II ганаровыя водгукі - за твор на модную тэму Чыка (цяпер прозвішча італьянскага праблеміста часцей транслітаруецца як «Кіка»).

Трэці прыз дастаўся калектыўнаму аўтару - **братам В. і С. Піменавым,** землякам Лашынскага. **12+11. 2х** Рашэнне: 1.К:c6!



Я.У.: *«Задача дае 4 перакрыцці туры на адной лініі, прычым усе яны скрыты і ўскладнены момантам зняцця чорнымі абароны з матавага поля».*

Чацвёрты прыз атрымаў **Г.Калугін** з Ленінграда. Гэтая адзнака сталася для аўтара не абы-якім суцяшэннем - 4 з 7 дасланых ім задач былі з розных прычын зняты з конкурсу.



**10+10. 2х** Рашэнне: 1.Ke8! Я.У.: *«Задача добра злучае актыўную і насычаную гульню дзвюх белых батарэй. Канструкцыя задачы ўдалая і робіць вельмі спрыяльнае ўражанне».* За іншую сваю задачу Г. Калугін атрымаў I пахвальны водгук.

Пяты прыз і спецыяльная прэмія за лепшае правядзенне тэмы «непрыкметных перакрыццяў» на роўных дасталіся дзвюм задачам трох аўтараў (гэта важна адцеміць, бо ў кнізе 1981 г. у якасці лаўрэата згадваецца толькі «Ю.Голубев»). **Ю.Галубеў** (Масква).



**9+14. 2х** Рашэнне: 1.К:d5!

**В. і С. Піменавы** (Растоў-на-Доне). **10+8. 2х** Рашэнне:



1.К4:d3! Я.У.: *«Першая - добрая задача… Ускладненне двух варыянтаў шахамі робіць яе вельмі арыгінальнай. На карысць задачы гаворыць і эканомны выдатак матэрыялу. Другая - арыгінальнае злучэнне непрыкметных перакрыццяў чорнай фігуры з таксама непрыкметным выключэннем белай. Звяртае ўвагу чысціня і акуратнасць апрацоўкі».*

Шосты прыз і спецпрэмію за лепшы блок узяў **Ул. Шыф** з Масквы (у канцы 1933 г. гэты вопытны складальнік будзе выбраны суддзёй Усесаюзнага конкурсу складання імя газеты «Комсомольская правда», які зладзіць ВСФК Беларусі).



**10+11. 2х** Рашэнне: 1.Фb4! Я.У.: *«Складаны механізм перамены матаў пры звязках. Аднак зусім не апраўданы ні пазіцыя паўзвязвання, ні звязка чорнай туры g3. Недастаткова выкарыстаны Кb2 і белы кароль. Пры дасціпным механізме задача тэхнічна вельмі не дасканалая».*

Што ж беларускія канкурсанты? Як пачатковец спецыяльную прэмію атрымаў мянчук **П.Абрамовіч** за наступную задачу, яна ж заслужыла і IV ганаровы водгук. **7+12. 2х** Рашэнне: 1.Л:f3! Я.У.: *«Як і задача Піменавых (V прыз), дае элемент скрытасці ў абароне чорных. Тут ён выяўляецца ў “непрыкметнасці” ўключэння туры a3 на h3.*



*Аднак у тэматычным і тэхнічным сэнсах гэтаму твору далёка да задачы Піменавых».*

Дзве задачы **М.Ратнікава** таксама былі адзначаны. Наступная, пад дэвізам «Індустрыя», - VI ганаровым водгукам. **9+8. 2х** Рашэнне:



1.Лb7! Я.У.: *«У задачы ў трох варыянтах праведзены скрытыя перакрыцці трох чорных фігур. Недахоп канструкцыі ў дрэнным выкарыстанні белага матэрыялу. Тэхнічны дэфект - слабасць першага ходу і грувасткасць пазіцыі».*

…А гэтая, пад дэвізам «Камбайн», - VI пахвальным водзывам. Яна стала ўсяго на прыступку ніжэй за задачу яшчэ аднаго будучага мэтра, А.П.Гуляева. **12+10.**



**2х** Рашэнне: 1.К:f4! Я.У.: *«Выразны прыклад механістычнага падыходу да шахматнай задачы».* Далей суддзя патлумачыў сваю з’едлівую заўвагу: *«Аўтар кажа сабе: “даць шах + звязку белай фігуры”. Раз-два-гатова. І шах, і звязка ёсць. Але спытаем: ці звязаны гэтыя моманты між сабой? Ці маецца між імі арганічная сувязь? Няма… здыміце з дошкі Фb1 - усё застаецца па-старому. Дзе ж тут непарыўная сувязь і еднасць?»* Крытыкаваў творчасць М.Ратнікава і Я.Камянецкі - тым не менш, у вышэйзгаданым матчы з расійцамі (1933-34 гг.) малады праблеміст і аматар практычнай гульні з Горак выступіў за беларускую каманду на 2-й дошцы, вышэй за І.Мазеля, Г.Верасава і іншых. Жытомірскі, адну з задач якога ў 1932 г. Я.Умноў занёс у 3-ю катэгорыю («здавальняючых»), зойме ў камандзе БССР 6-ю дошку.

Адносны поспех усесаюзнага конкурсу «ЧБ» 1931–32 гг. - паводле вядучага, гэта быў *«адзін з лепшых конкурсаў апошніх гадоў»*, - натхніў Я.Камянецкага на задуму *«2-га Міжнароднага конкурсу складання 2-х ходовых задач»*, прысвечанага Усебеларускай спартакіядзе 1933 г. Умовы ён абвясціў у «ЧБ» №4 (люты 1933 г.). Задачы мусілі прымацца да 15 красавіка 1933 г. - ад *«членаў савецкай шахматнай арганізацыі і рабочых шахматыстаў замежных краін»*. Суддзямі павінны былі выступіць усе ўдзельнікі, якія ацанілі б 40 твораў, папярэдне адабраных з агульнага ліку секцыяй кампазіцыі пры выканаўчым бюро шахсектара ВСФКБ. Грандыёзныя планы не ажыццявіліся - увесну 1933 г. часопіс «Чырвоная Беларусь» пад рэдакцыяй пісьменніка Міхася Чарота (якога расстраляюць у 1937-м) спыніў выхад. Дый наагул *«рабочым шахматыстам»* у той час было не да кампазіцыі - перамога Гітлера карычневым ценем накрыла Еўропу. Першым і апошнім міжнародным спаборніцтвам па ШК у даваеннай БССР застаўся конкурс газеты «Зьвязда» 1928-31 гг. (гл. пра яго: «Альбино», №89-90, 2010).

***Вольф Рубінчык,***
***г.Мінск***
***rubinczyk@yahoo.com***

[1] Памылковае ўспрыманне гэтага конкурсу як «міжнароднага» перацячэ, аднак, і ў XXI ст.: гл. часопіс «Шахматы» №4/2005, с.42.

[2] Тут і далей у цытаты ўнесены нязначныя арфаграфічныя і стылістычныя праўкі.

# Пьедестал - у композиторов

Брестская газета «Заря» 17.03.2012 сообщила, что состоялся чемпионат Ганцевичского района по шахматам, собравший 12 участников. Победил мс по композиции Иван Бондарь (учитель Любешовской СШ), на втором месте - также известный читателям «Альбино» Николай Агейко, кмс, решатель и составитель, педагог Центра детского и юношеского творчества, на третьем - перворазрядник. инженер-строитель ПМК-14 Николай Наумик.

# ПУБЛИКУЕТСЯ ВПЕРВЫЕ

**№1. Михаил Кошель (Минск).**



**9+8. 2х**

1.Фf1? ~ 2.Кc6х, 1...de 2.Л:e4х, 1...К~ 2.Фf6х, но 1...Кf2! Решает 1.Л:d4! ~ 2.Л:e4х, 1...Кр:d4 2.Кc6х, 1...Крf4 2.Фс7х, 1...f5 2.Кс4х, 1...К~ 2.Кс6х

**№2. Павел Радюк (Минск).**



**6+3. 3х**

1.a5! zz 1...Крb5 2.Лb7+ Крс4 3.Лb4х, 2...Кр:a5 3.Сс3х, 1...с5 2.Кра4 cd 3.Лс7х

**№3. Михаил Крупник (Минск).**



**9+7. 2х**

1.Фс3! С:с3 2.К:с7х, 1...Л:с3 2.Кf6х, 1...Ф:e8 2.Сс4х

**№4. Михаил Крупник (Минск).**



**6+4. 4х**

1.Се5! f6 2.h7 fe 3.h8Ф ed+ 4.Ф:d4х, 2...f5 3.h8Ф f4 4.Фd8х

**№5. Валерий Резинкин (Минск).**

**8+6. 3х**



1.Cd1! zz 1...g5 2.Фf5+ Kpd4 3.Ke2х, 1...Kpe6 2.d4 g5 3.Фf5х, 1...Kpd4 2.Фe3+ Kpd5 3.Cf3х, 1...e6 2.Ke2 и 3.d4х

**№6. Валерий Резинкин (Минск).**



**7+3. 4х**

1.Kpg4! zz 1...Kpd4 2.Kpf4, 3.Ke7 и 4.Kc6х, 1...b5 2.Cc5, 3.f4+ Kpe4 4.Kf6х, 1...f6 2.Ke7 Kpd4 3.Kpf4 и 4.Kc6х

**№7. Александр Шевчук (Гомель).**



**5+7. 2х**

1.Фd7! Л:d7 2.Ke6х, 1...Л:g5 2.Фd2х, 1...Kp:g5 2.Фg4х

**№8. Александр Шевчук (Гомель).**



**4+4. 3х**

1.Фe6! ~ 2.Фf7х, 1...Kd8 2.Фf7+ K:f7 3.Ke6х, 1...Kpg7 2.Фf7+ Kph8 3.Фh7х

**№9. Александр Шевчук (Гомель).**

*См. следующую диаграмму*

**8+4. 3х**

1.0-0-0! Kp:a4 2.Kpc2 Kpa5 3.Лa1х, 1...Kpa2 2.Cd5+ Kpa1 3.Kpc2х, 1...b4 2.Kpb1 Kpc4



3.Cd5х

**№10. Александр Белый (Мозырь).**



**6+3. 2х** 1.Cd4!

**№11. Александр Белый (Мозырь).**



**8+5. 2х** 1.Ca8!

**№12. Александр Белый (Мозырь).**



**5+1. 3х**

1.Kg3! zz 1...Kpe8 2.Фa7, 1...Kp~ 2.Kf5.

**№13. Александр Белый (Мозырь).**



**10+10. 3х**

1.Ch8! ~ 2.Kf6х, 1...Ф:f5 2.Kb4+, 1...Ф:b5(C:f5) 2.Kf6+, 1...Kg4 2.fg+, 1...Ke4 2.fe+, 1...Ce5 2.C:e5, 1...Kd7 2.Л:d7, 1...Cf8 2.Kc7+

♔ ♛ ♕ ♚

# VIII ЧЕ по решению

прошёл 20-22 апреля 2012 года в Киеве. 14 команд распределились в итоге так: 1. Сербия - 190,25; 2. Польша - 189,25; 3. Россия - 177,5; 4. Украина-1 - 176,25; 5. Азербайджан - 168; 6. Литва - 154; 7. Великобритания - 148,75; 8. Финляндия - 148,5; 9. Словакия - 143,5; 10. Украина-2 - 141,75; 11. Беларусь - 134,75; 12. Словения - 120,5; 13. Румыния - 113,5; 14. Израиль - 83,25.

В личном зачёте (67 решателей): 1. Пётр Мурдзя (Польша) - 70,75 из 90; 2. Владимир Подинич - 70,5; 3. Боян Вучкович (оба - Сербия) - 65. Результаты белорусов: 14. А.Булавка - 54,75; 39. Н.Сигневич - 41; 46. М.Храмцевич - 37,25; 61. В.Зеленковский - 23,5. На счету Александра Булавки - «бронза» опен-турнира.

---

**Павел Радюк** прислал нам своё очередное размышление:

- В обществе образ первобытного человека стал супермодой - обнажаемся, обрастаем необычными причёской, бородой и усами... По внешнему виду обновляемся и нередко даже похожи чуть-чуть на *человекоподобных*.

---

**14 декабря 2011 года в возрасте 60 лет скоропостижно ушёл из жизни наш читатель, автор присланных на наши конкурсы задач Александр Александрович Николичев (г.Бор Нижегородской области).** В некрологе Кирилл Урусов пишет: «Почти всю свою трудовую жизнь Александр проработал экономистом на машиностроительном заводе в Нижнем Новгороде... Шахматами увлекался с детства, много играл в детских и юношеских турнирах, а также по переписке, дошёл до кмс. Всю жизнь собирал библиотеку по композиции... Еженедельно без малейшего перерыва на протяжении нескольких лет он присылал мне на проверку по два десятка задач, упорно исправлял их, устраняя дефекты, переделывая порой по десять и более раз одну задачу. Составлял кроссворды и сочинял добрые эпиграммы на коллег по увлечению. В обыденной жизни был крайне скромен и равнодушен к бытовым благам, известности, тщеславию. А ведь у него уже было опубликовано около 200 задач. Александр, живя на скромную зарплату, ещё и помогал В.Иванову (Карелия, «Семь шахматных нот»), А.Угнивенко (Украина, «ЧБС»)».

# К ЮБИЛЕЮ Е.И.ДВИЗОВА

**В этом году своё 75-летие отметил известный белорусский этюдист Евгений Иванович Двизов. Предлагаем вниманию читателей статью Николая Шуканова «Музыка на шахматной доске», опубликованную в жлобинской газете «Новы дзень» 11.05.2010.**

Вот уже 15 веков человечество наслаждается величайшей интеллектуальной игрой - шахматами. Есть в этом мире и свои «композиторы». В том числе в Жлобине. Самый известный из них и самый титулованный - Евгений Иванович Двизов.

Евгений Иванович давно на заслуженном отдыхе (долгие годы не без успеха работал тренером по водному поло и плаванию). Но у творчества нет пенсии. И сегодня продолжает писать «шахматную музыку», активно занимается судейством, ведёт обширную переписку со своими коллегами по шахматному «музыкальному цеху» по всему миру.

Шахматами Е.И.Двизов по-настоящему «заболел» еще в школьные годы. Было это в конце 40-х годов, когда он учился в тогдашней Жлобинской железнодорожной средней школе №9 (сам Евгений Иванович родом из Гомеля, а в Жлобине живет в 1945 года). Тогда шахматы были массовым увлечением. В них играли везде, мал и стар - за школьными партами, на производстве во время обеденных перерывов, во дворах. Тогда же в Жлобине был проведен первый чемпионат города по шахматам. Чемпионом стал Георгий Ишу. С ним десятилетний Евгений тягаться ещё не мог. Но уже в 1954 году он обошёл его, став победителем районного чемпионата (что интересно, записи того турнира сохранились в личном архиве Двизова).

И всё же Евгения Ивановича в шахматах привлекал не запал турнирной борьбы, а спокойный анализ игры. В нём возобладал не игрок, а шахматный композитор. При этом предпочтение было отдано этюдам. В 1964 году была опубликована его первая композиция. А всего за почти полвека творческой деятельности свет увидели более 150 этюдов Двизова, как в советских и белорусских шахматных изданиях, так и за рубежом - в Аргентине, Англии, других странах. В 1975 году в Испании увидел свет всемирный шахматный сборник, в который были включены 1375 лучших этюдов, составленных в период с 1935 по 1973 год включительно. Нашлось там место и для этюдов нашего земляка.

Имя Е.И.Двизова стало широко известно шахматной общественности Беларуси в самом начале 70-х годов. Тогда завершился 1-й чемпионат республики по шахматной композиции в разделе этюдов. Его победителем и стал Евгений Иванович. Затем были победы во 2-м и 3-м подобных чемпионатах. Ещё раньше, в 1966 году, наш земляк был включён в сборную команду Беларуси по шахматной композиции и становится дважды чемпионом Советского Союза в командном зачёте, а также завоёвывает с командой чемпионское звание в разделе этюдов. Членом сборной команды Беларуси он оставался до 2000 года, ещё не раз занимая призовые места на всесоюзных турнирах и в турнире СНГ.

Особенно памятным для Е.И. Двизова было участие в знаменитом матче сборных СССР и «Остального мира» (1989-91 годы). Тогда сборная СССР одержала убедительную победу со счётом 2224:497. Заметный вклад в эту победу внёс и Евгений Иванович, один из его этюдов вошёл в число 30 лучших зачетных.

С именем Е.И.Двизова связано и появление первого в Беларуси серьёзного издания по шахматной композиции. Речь идёт о книге «Шахматная композиция в Белоруссии» (Минск, 1981 год), написанной в соавторстве с Н.Бельчиковым и В.Гебельтом.

...Е.И.Двизова в его квартире мы застали за анализом этюдов, представленных на республиканский конкурс, посвященный 100-летнему юбилею основоположника шахматного этюда в Беларуси Г.В. Афанасьева. С ним Евгений Иванович в своё время в соавторстве опубликовал более 70 этюдов. Данный конкурс, который курирует Е.И. Двизов, - дань памяти друга.

# СКАНВОРД

**Составил В.Рубинчик, г.Минск**




Белорусский этюдист

**По горизонтали:** Гесер, Осмо, Двизов, Сета, Кабак, Чепа, Личко, олово, Костин, дока. **По вертикали:** Леко, Карт, «Гидра», Брон, спина, Клод, Роос, Иво, сверчок, Романов.

# ДЕВЯТОЕ КОМАНДНОЕ

Продолжается девятое командное первенство мира по составлению (9 WCCT). 23-25 марта несколько белорусских проблемистов встретились в Гомеле, чтобы обсудить и скомплектовать посылку нашей команды. По расписанию капитан А.Булавка оформил и выслал композиции главному судье к 15 апреля. В итоге белорусскую команду на всемирном командном форуме представляют Н.Бельчиков, И.Бондарь, В.Бартош, А.Булавка, Н.Быков, В.Волчек, В.Зайцев, В.Сычов, В.Фригин, М.Храмцевич и другие. В июне-июле организаторы составят специальный сборник всех поступивших произведений от 40 участвующих команд для того, чтобы к 1 октября представить замечания и предложения. После этого по 5 стран-судей в каждом из 7 разделов к 1 июня 2013 года должны вынести свои присуждения (оценки) по каждой поступившей композиции.

К 1 октября 2013 года намечено подвести итоги и выпустить специальную брошюру. Белорусским судьям доверено присудить многоходовки и задачи на обратный мат (в числе пяти арбитров в каждом разделе). Так что впереди - напряжённая работа.

# Есть идея!

**Один из наших читателей предложил ввести новую рубрику «Визитная карточка» и оставил в ней свои координаты:** *Кошель Михаил Игоревич, 220136, г.Минск-136, а/я 166. Тел. (8-017) 2581650, МТС (8-029) 8515832.* На этот же адрес желающие могут присылать ему свои оригинальные задачи для шахматного отдела, который открылся в районной газете «Край Смалявіцкі».

# СТОГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ Г.М.ВЕРАСАВА

**Да 100-годдзя першага ў Беларусі міжнароднага майстра па шахматах публікуем яго аўтабіяграфію з архіва Нацыянальнай акадэміі навук, запоўненую пры паступленні Г.М.Верасава на працу ў Інстытут гісторыі. Загад ад 23.01.1952 аб прыёме на пасаду старшага навуковага супрацоўніка сектара навейшай гісторыі па сумяшчальніцтве падпісаў акадэмік Нікольскі. Праўда, адпрацаваў Верасаў на гэтай пасадзе нядоўга, пару месяцаў. Жыў ён у той час на вул.Цнянскай, 74, а членам прафсаюза быў з 1930 г. (чамусьці «знешняга гандлю», як ён пазначыў у лістку па ўліку кадраў).**

### Автобиография
### Вересов
### Гавриил Николаевич



Родился я 28 июля 1912 г. в г.Минске, в семье журналиста. Отец до революции работал в минских и киевских газетах левого направления, принимал участие в земельном движении в Белоруссии. Юбилейное издание ЦИК БССР положительно оценило его дореволюционную деятельность как деятельность, полезную для развёртывания революционного движения в Белоруссии.

После революции отец работал в республиканских газетах Белоруссии. Умер он в 1935 г.

Мать занималась домашним хозяйством и воспитанием детей. В 1942 г. мать умерла.

Моя трудовая деятельность началась в 1929 г., после окончания средней школы.

С 1929 г. до поступления в университет (в 1933 г.) я работал арматурщиком на строительстве шёлковой фабрики в Могилёве, затем инструктором по арматуре на строительстве «Дома печати» в Минске, инспектором Белорусского совета физкультуры, директором шахматной базы Московского совета профсоюзов и, наконец, станковым на заводе стандартных домов в Минске.

В 1933 г. я поступил на физико-математический факультет Белорусского Гос. Университета. После окончания 4-х курсов стационарного отделения перевёлся на заочное отделение университета, которое закончил в 1939 г.

Ещё во время пребывания в университете я сотрудничал в белорусских газетах. С 1933 г. до начала Великой Отечественной войны я работал литсотрудником газет «Советская Белоруссия», «Звязда» и издаваемой в Минске газеты на польском языке «Sztandar wolnosci». Одновременно работал преподавателем Минского Дворца пионеров и Белорусского института физкультуры.

Во время учёбы и позднее я уделял большое внимание физкультурной, общественной и спортивной деятельности. В течение многих лет был чемпионом Белоруссии по шахматам. Участвовал во многих всесоюзных и международных соревнованиях. В 1937 г. мне было присвоено звание мастера спорта СССР, а в 1950 г. звание международного мастера по шахматам. Ряд лет был председателем Белорусской шахматной секции и членом президиума Всесоюзной шахматной секции.

В начале июля 1941 г. ушёл добровольцем на фронт. После кратковременного пребывания в строевом подразделении в качестве рядового бойца, я был назначен инструктором-литератором газеты 7-й гв. стр. дивизии. Участвовал непосредственно в боях. В боевой характеристике, выданной командованием 7-й гв. стр. дивизии, сказано: «Тов. Вересов проявил в боях под Ярцево огромное мужество и отвагу, подымая своим героизмом бойцов на подвиги».

В октябре 1941 г. был тяжело ранен. До марта 1942 г. находился в госпитале на излечении, после чего был направлен в действующую армию в качестве литературного сотрудника газеты II-го гв. стр. корпуса. В сентябре 1942 г. был принят в ряды ВКП(б). После ликвидации корпусных газет (январь 1943 г.) работал инструктором политотдела 39-й армии. С августа по декабрь 1943 г. учился на курсах усовершенствования командного состава.

В начале 1944 г. приказом Г. У. К. НКО (Главное управление кадров Народного комиссариата обороны - прим. ред.) был передан в распоряжение Белорусского штаба партизанского движения.

В июле 1944 г. был зачислен в аппарат Министерства иностранных дел БССР на должность ответственного референта политотдела.

С сентября 1944 по май 1945 г. работал представителем Белорусского Совнаркома при Польском Правительстве по делам переселения. После этого вновь работал в аппарате МИД БССР зам. зав. политотделом. Длительное время исполнял обязанности заведующего политотделом.

В октябре 1948 г. был принят в аспирантуру Академии общественных наук при ЦК ВКП(б). 5-го октября 1951 г. защитил кандидатскую диссертацию на тему «СССР и борьба народно-демократической Польши за западные земли».

Женился я в 1934 г. Жена Николаенкова Таисия Кузьминична после окончания Университета в 1937 г. работала преподавателем математики в средней школе. Во время немецкой оккупации находилась в Минске. В это время работала преподавателем арифметики в пригородной сельской школе-пятилетке, в деревне Кальваришки. После освобождения Минска и по настоящее время работает преподавателем Минского политехникума.

Имею сына Валерия, рожд. 1945 г.

В составе нашей семьи было два брата и сестра. Брат Николай, по специальности инженер, член ВКП(б) с 1925 г., погиб на фронте в 1942 г. Второй брат, Георгий, в начале 30-х годов, находясь на лагерном сборе, был послан на розыск дезертира. В связи с безуспешностью розыска Георгий был арестован. Следствие установило его невиновность, после чего был освобождён. До войны Георгий работал зав. отделом Белпромпроекта.

В начале войны Георгий захвачен был гитлеровцами в плен, но вскоре бежал к партизанам. С начала 1942 г. до освобождения Белоруссии он работал начальником особого отдела партизанского отряда. Награждён «орденом Отечественной войны» и партизанской медалью I-й степени. В настоящее время работает зав. отделом Белторфпроекта.

30-XII-1951 г. Подпись: Г.Вересов.

***Падрыхтаваў да друку В. Рубінчык з дапамогай М.Токарава (Мінск)***

---

## Задачи-лауреаты

**№1. В.Резинкин. «Шкатулка Забайкалья», 3 похв. отзыв.**



**8+12. 3x**

1.Фе5! ~ 2.Kd2+ cd 3.Kb2x, 1...Ce1 2.Ф:h8 и 3.Фd4x, 1...d4 2.Ka5+ ba 3.Фc5x, 1...Л:f8 2.Фd6.

**№2. В.Резинкин. «Задачи и этюды», 2 похв. отзыв.**



**10+12. 3x**

1.Kd8! ~ 2.Фf4+ Kpd5 3.Фe5x, 1...Лe2 2.Фf3+ Kp:f3 3.Cg2x, 1...g5 2.Фf5+ Kp:f5 3.Cd3x, 1...e5 2.Фd5+ Kp:d5 3.Kf6x, 2...Kpf5 3.Ф:e5x

**№3. В.Резинкин. «Troll», похв. отзыв.**



**4+3. 4x**

1.C:h4! ~ 2.Фf3+ Kpg1 3.Фh3 и 4.Cf2x, 1...Cd7 2.Фd1+ Kpg2 3.Kf2 и 4.Ф-h1x, 1...Cc6 2.Kf2 Cf3 3.Ф:f3 Kpg1 4.Фh1x

**№4. В.Резинкин. «Задачи и этюды», 2010, 2 похв. отзыв.**

**5+7. 5x**



***а)*** 1.Cc7! ~ 2.C:d6 f4 3.C:f4 d5 4.Kg3+ Kpg1 5.C:e3x, 1...f4 2.Cb8 d5 3.C:f4 d6 4.Kg3+ Kpg1 5.C:e3x; ***б) без пd7:*** 1.Cc7? f4! 2.Cb8 f5! 3.C:f4 пат. Решает 1.Ca5! f4(d5) 2.Ce1 d5(f4) 3.Cf2 ef 4.Kp:f2 f3 5.Kg3x

# КОНЬ-АГОНЬ І КОНЬ-ДОКТАР

Правадыру гунаў Атылу прыпісваюцца словы: «Трава не расце там, дзе скача мой конь». Успаміны пра «каня Атылы» з папулярнай кнігі Яўгена Гіка «Шахматы і матэматыка» (у нейкай задачы гэты конь пакідаў пасля сябе «выпаленую прастору», г.зн. не мог стаць на адно поле двойчы) натхнілі на стварэнне новай казачнай фігуры «конь-агонь». Кожным крокам гэты конь «выпальвае» на сваім шляху адно поле з ліку тых, што кантралюе - прычым не толькі для сябе, а і для ўсіх іншых фігур. Напрыклад, конь-агонь, скокнуўшы з b2 на c4, можа вывесці з гульні або зыходнае поле b2, або любую з сямі іншых кантраляваных клетак - нават у тым выпадку, калі на гэтых клетках стаяць свае ці чужыя фігуры. Цераз палі, выведзеныя з гульні, ужо не здолеюць пераскочыць ні ферзь, ні тура, ні слон, дый нават варона не пераляціць. На дыяграме такія палі павінны пазначацца адмыслова - напрыклад, крыжыкам («х»).

Выпальваць поле, дзе стаіць свой ці чужы кароль, каню-агню забаронена, аднак ён, як і яго больш звыклыя суродзічы, можа біць чужыя фігуры, даваць шах і мат. Новая фігура не валодае недатыкальнасцю. У той жа час гулец, які мае каня-агня, не можа выкарыстоўваць яго выключна як простага каня, то бок адмаўляцца ад выпальвання тэрыторыі на дошцы.

Англамоўны варыянт назову - Knight-Fire (KF), рускамоўны - «конь-огонь» (КО). Мяркую, на дыяграме новая фігура мусіць выяўляцца фігуркай каня з літарай «F» унутры. У натацыі яе рух варта перадаваць так: 1.КАc4(xe5x), што значыць: конь-агонь скокнуў на c4, спаліўшы поле e5.

Прыклады задач з канём-агнём:

**В.Рубінчык, 2011. 3+2. На c3 - чорны конь-агонь.**



**Каапмат за 2 хады.** Рашэнне: 1.КАd1(xb2x) Кc3+ 2.Крa1 Кc2x

**В.Рубінчык, 2011. 6+2. На g4 - белая варона, на h6 - белы конь-агонь. Мат за 3**



**хады.** Відавочна, што, калі стаяць на месцы, чорныя перакрыюць дыяганаль e5-h8 (напрыклад, 1.d7? Сf6). Таму напрошваецца нейтралізацыя чорнага слана. Рашае 1.КАf5 (xe7x)! Крg8 2.Лd8+ Крf7 3.КАh6(xg8x)x Варона з g4 трымае поле e6. Дакладнасць патрэбная да канца: калі б белыя абвясцілі, што трэцім ходам выпальваюць поле f5, чорныя маглі б пайсці каралём на e6. Не праходзіць 1.КАg8(xe7x)?, бо чорныя папросту забіраюць каня-агня і пасля 2.Лd8+ ідуць каралём на f7, а не вяртаюцца на h7.

Ці ёсць ратаванне ад цуда-скакуна, які, дай яму волю, за 64 хады спаліць усю дошку? Ёсць! Гэта конь-доктар (КД, KD - ад Knight-Doctor). Ён мае толькі адну адметнасць: «нападаючы» на выпаленае поле, конь-доктар аўтаматычна вяртае яго ў гульню. На дыяграме КД - фігурка каня з плюсікам унутры. Ход новай фігуры на f7 з «лячэннем» поля e5 будзе выглядаць так: 1.КДf7(+e5+).

Прыклады задач з канём-доктарам:

**В.Рубінчык, 2011. 7+7. На f7 - белы конь-доктар, на h7 - чорны конь-агонь.**



**Мат за 4 хады.** Спакусліва намерыцца даць мат з лініі «a»: 1.Крb6 ed 2.Крc7 d5 3.Лd3, але 3…b4! Такім чынам, перспектыўны шлях - адразу загразіць каралю матам: 1.Сc7! У чорных - адна абарона: 1…КАf8(xd7x). Аднак белы конь-доктар уступае ў гульню і ліквідуе «мёртвае поле», ахвяруючы сабою: 2.КДe5(+d7+). Чорныя вымушаны зноў скарыстоўваць каня-агня: 2…КАd7 (xb8x). Здаецца, зараз чорны кароль надзейна абаронены ад белай туры, прынамсі за два хады яна да яго не дабярэцца: 8-я гарызанталь перакрытая. Але туру ўключаць і не абавязкова: пасля 3.КДd7 (+b8+) белыя даюць мат 4.КДb6x (тут конь-доктар працуе ўжо як звычайны конь). Няма сэнсу ў 1.Сe5? - пасля 1…КАf8 (xd7x) белым не ўдасца хутка пераадолець бар'ер на d7. На 1.Сe7? не праходзіць 1…Крb8? 2.Лd8+ і 3.Сd6x, але дастаткова 1…КАf8 (xd7x) 2.КДe5 (+d7+) КАd7(xe5x) 3.Лd7 Крb8 - аднак не 2…КАd7 (xb8x) з-за 3.Лd7 і 4.Лa7x

**В.Рубінчык, 2011. 4+11. На a3 - белы конь-доктар, на b6 - чорны конь-агонь. Каапмат за 2**



**хады.** Відавочна, мат будзе дадзены канём-доктарам, але трэба сачыць, каб апошні ўступіў у гульню толькі пасля каня-агня, іначай КД не паспее «вылячыць» спаленае поле на дыяганалі a5-d8, і чорны кароль уцячэ... Таму 1.КАa8 (xc7x) КДb5 (+c7+) 2.Лa7 КДa7x Калі б на a3 і b6 знаходзіліся звычайныя коні, гэта ўмагчыміла б перастаноўку хадоў: 1.Лa7 Кb5 2.Кa8 Кa7x

**Ласкава запрашаю кампазітараў і практыкаў асядлаць мадэрнізаваныя коні!**

*Вольф Рубінчык, г.Мінск*
*rubinczyk@yahoo.com*




*Реклама с сайта newsru.co.il.*

# ПЕШКА-ФАНТАН

Гэтая навінка крочыць, б'е, абвяшчае шах і мат, як звычайная пешка, аднак кожным ходам «змывае» свае і чужыя фігуры ўперадзе сябе - як па вертыкалі, так і па дыяганалях. Напрыклад, пешка-фантан (ПФ), якая вырушыла з e2 на e4, адным ходам можа змыць белага каня на c6, чорнага ферзя на e8 і чорную пешку на h7 - пры ўмове, што на адрэзках e4-c6, e4-e8 і e4-h7 няма іншага матэрыялу. Адным ходам ПФ можа анігіляваць толькі па адной фігуры (пешцы) на кожнай з ліній. Так, калі наступным разам белыя пойдуць ПФe4-e5, а на палях d6 і c7 будуць знаходзіцца чорныя пешкі, то знікне толькі пешка d6. Караля ПФ змываць не мае права; такім чынам, кароль абараняе сабой ад «струменя» і іншыя фігуры, якія месцяцца за ім.

Па-руску навінка называецца «пешка-фонтан» (таксама ПФ). Па-англійску і па-французску скарачэнне будзе PF (pawn-fountain, pion-fontaine). Маляваць на дошцы яе варта як пешку з трыма рыскамі-«струменьчыкамі» зверху і збоку. Выходзіць нешта сярэдняе паміж пешкай і  ферзем, што, у прынцыпе, адпавядае яе ўласцівасцям. Даходзячы да 8-й (1-й) лініі, пешка-фантан ператвараецца ў любую фігуру.

Прыклады задач з пешкай-фантанам:



**В.Рубінчык, 2012. 3+2. 2x На d2 белая пешка-фантан, на f6 чорны вожык.** Рашэнне: 1.ПФd4 Крh8 2.Лf8x Проста ўзяць вожыка на f6 белая тура не можа, бо тады знікне сама (гл. «Альбіно», №77-78) - значыць, трэба яго змыць…



**В.Рубінчык, 2012. 3+5. H2x На d6 чорная пешка-фантан.** Рашэнне: 1.ПФd5 Лb4 2.Крh2 Лh4x Змываюцца два бар'еры для туры b2 - слон b3 і пешка e4.

*Вольф Рубінчык, г.Мінск*
*rubinczyk@yahoo.com*